Источник: "Звязда" - 2018-03-27

# ГІСТОРЫЯ КУЛЬТУРЫ. І БЕЛАРУСКІ КАСЦЮМ

**Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі, Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя Кандрата Крапівы і Цэнтральная навуковая бібліятэка імя Якуба Коласа НАН Беларусі на сумеснай імпрэзе прэзентавалі два важныя навуковыя выданні. Гэта серыя «Нарысы гісторыі культуры Беларусі» ў 4 тамах (пад навуковай рэдакцыяй акадэміка НАН Беларусі Аляксандра Лакоткі), якая выйшла ў выдавецтве «Беларуская навука», а таксама кнігі кандыдата гістарычных навук Валянціны Бялявінай і доктара гістарычных навук Любові Ракавай «Беларускі касцюм», надрукаванай выдавецтвам «Беларусь».**



Чатырохтомнае фундаментальнае выданне «Нарысы гісторыі культуры Беларусі», у якім адлюстравана гісторыя культуры Беларусі ад эпохі Сярэднявечча да нашых дзён, стала вынікам шматгадовай працы вучоных Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя Кандрата Крапівы. Першы том серыі прысвечаны пытанням паходжання, фарміравання і развіцця шляхецкай культуры XIV — пачатку XX стагоддзя. У другім томе разглядаюцца асаблівасці эвалюцыі культуры беларускага горада ў X — пачатку XX стагоддзя. Трэці том складаецца з дзвюх кніг, у якіх асвятляюцца асаблівасці эвалюцыі матэрыяльнай і духоўнай культуры беларускай вёскі XIV — пачатку XX стагоддзя. Завяршае серыю чацвёрты том, дзе аналізуюцца этапы эвалюцыі, тэндэнцыі і вопыт айчыннай архітэктуры, прафесійнага выяўленчага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, традыцыйных мастацкіх рамёстваў, экранных мастацтваў, музычнага і тэатральнага мастацтва XX — пачатку XXI стагоддзя. Такое даследаванне не мае аналагаў і з'яўляецца фундаментальнай асновай для навуковага суправаджэння развіцця нацыянальнай культуры.

Праца-падсумаванне этнолагаў Бялявінай і Ракавай «Беларускі касцюм» упершыню раскрывае гістарычнае развіццё касцюма ўсіх асноўных сацыяльна-саслоўных груп гарадскога і вясковага насельніцтва Беларусі з ранняга сярэднявечча да сучаснасці. Да нядаўняга часу пад касцюмам беларусаў разумеўся толькі традыцыйны касцюм вяскоўцаў, тады як велізарны пласт культуры магнатаў, шляхты і гараджан заставаўся за межамі інтарэсаў даследчыкаў. Таму праца Бялявінай і Ракавай з'яўляецца вельмі актуальнай і запатрабаванай. Аўтары сабралі велізарны фактычны матэрыял, значная частка якога ўпершыню ўведзена ў навуковы зварот, і прааналізавалі яго з дапамогай новых метадалагічных пазіцый. Кніга багата праілюстравана творамі мастацтва XVI—XIX стагоддзяў і фотаздымкамі XIX—XX стагоддзяў.

Спецыяльна да прэзентацыі выданняў была падрыхтавана кніжная выстаўка, прысвечаная гісторыі беларускага касцюма, жаночага і мужчынскага, развіццю ткацтва, вышыўкі і іншым прыкладам мастацкага аздаблення адзення.

> **Да нядаўняга часу пад касцюмам беларусаў разумеўся толькі традыцыйны касцюм вяскоўцаў, тады як велізарны пласт культуры магнатаў, шляхты і гараджан заставаўся за межамі інтарэсаў даследчыкаў.**

На выстаўцы ў Цэнтральнай навуковай бібліятэцы імя Якуба Коласа НАН Беларусі прадэманстраваны таксама апошнія найбольш цікавыя выданні Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі, прысвечаныя беларускай традыцыйнай культуры, вясковай і гарадской, а таксама духоўнай культуры беларусаў.

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ**